ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЖНІЎНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 163 (28021) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Студатрад у белых халатах**



**Першакурснік — як многа ў гэтым слове!**



**Хто ён, Адам Мальдзіс?**

СТАР. 6-7

*ЛІЧБА ДНЯ*

**4 млн 473,3 тысячы чалавек**

*было занята ў эканоміцы краіны сёлета ў ліпені. Гэта на 1,5% менш, чым у ліпені мінулага года, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Арганізацыямі (без суб'ектаў малога прадпрымальніцтва) у ліпені гэтага года прынята на працу 73,2 тыс. чалавек (2,3% сярэднямесячнай колькасці), у тым ліку на дадаткова ўведзеныя працоўныя месцы — 3,3 тысячы. Звольнена па розных прычынах 70,7 тыс. чалавек. З іх 4,7% — за прагул і іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны, 0,9% — у сувязі са скарачэннем колькасці або штату работнікаў, ліквідацыяй арганізацый. Па звестках Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, колькасць зарэгістраваных беспрацоўных на канец ліпеня склала 46,6 тыс. чалавек. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на канец ліпеня гэтага года склаў 1% ад эканамічна актыўнага насельніцтва.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.08.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17700,00 | ▼ |
| Еўра | 20356,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 255,13 | ▲ |
| Укр. грыўня | 834,91 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ШКОЛЬНЫ ЗВАНОК НА ДВАІХ

**Віцебскія блізняты Кіра і Ірына КАВАЛЕНКІ сёлета стануць першакласніцамі гарадской 45-й школы. Дзяўчынкі сядуць за парту падрыхтаванымі: яны ўжо ўмеюць чытаць, пісаць і лічыць.**



Фота БЕЛТА.

■ Рынак працы

## ВУЧЫЦЦА НІКОЛІ НЕ ПОЗНА?

### Часцяком «пазлы» вакансій не супадаюць з магчымасцямі і патрабаваннямі прэтэндэнтаў на працоўнае месца

**Мая юная суседка атрымлівае юрыдычную адукацыю завочна, але ўжо сёння лічыць, што можа працаваць па спецыяльнасці. Вось толькі ніхто не прагне браць яе на работу. Гавораць, што юрысты не патрэбны. Дарэчы, як і эканамісты, бухгалтары, ахоўнікі, інжынеры, сацыяльныя супрацоўнікі, пaмочнікі выхавальнікаў. Больш за тое, сёння залішнія на рынку працы і грузчыкі, кладаўшчыкі, дворнікі, вартаўнікі, прыбіральшчыкі...**

Тым часам на пачатак жніўня ў гомельскім гарадскім банку даных ёсць інфармацыя пра 767 вакансій. Патрабуюцца, у асноўным, рабочыя высокай кваліфікацыі. Або спецыялісты ў галіне медыцыны. Накшталт: акушэрка, медыцынскі судовы эксперт, урач, медыцынская сястра... А тыя 2711 грамадзян, якія зараз стаяць на ўліку ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама, не адпавядаюць запытам наймальнікаў.

Практычна ва ўсіх выпадках такой неадпаведнасці ім прапануюць набыць новую спецыяльнасць. **Начальнік аддзела прафарыентацыі, прафадукацыі і інфармацыйнай работы ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама Таццяна КРУПЯНКА** адзначае, што пералік прафесій, якія прапануюць згодным перавучвацца, абумоўлены запатрабаваннямі на рынку працы:

— Але ж мы гатовы накіраваць на навучанне беспрацоўнага, які знайшоў працу па прафесіі вельмі спецыфічнай, яму неабходна навучанне і яго згодны чакаць наймальнік. У такім выпадку па гарантыйным пісьме ад прадпрыемства мы накіроўваем на навучанне беспрацоўных. Таксама працуем з прадпрыемствамі і прапануем ім пакрыццё затрат на навучанне супрацоўнікаў. Мы штогод закладаем грошы і на кампенсацыю. Калі плануецца скарачэнне па адной прафесіі, але патрэбны спецыялісты па іншай, калі прадпрыемства гатова сваіх супрацоўнікаў перавучваць, па іх заяўцы можам кампенсаваць кошт выдаткаў на навучанне гэтых супрацоўнікаў.

СТАР. 3

■ На слыху

## ЦЭНЫ НА АЙЧЫННЫЯ ЛЕКІ — ПАД КАНТРОЛЕМ



**70 працэнтаў беларускіх лекаў, што рэалізуюцца на ўнутраным рынку, знаходзяцца ў цэнавым дыяпазоне да 1 долара ў эквіваленце. А 35 найменняў лекаў выпускаюцца з адмоўнай рэнтабельнасцю, прычым па некаторых пазіцыях планавая стратнасць дасягае 40%. Тым не менш па выніках першага паўгоддзя доля айчынных лекаў вырасла на ўнутраным рынку ў фінансавым эквіваленце да 48,5 працэнта. Аб гэтым паведаміў журналістам намеснік дырэктара Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці Міністэрства аховы здароўя Віктар ШЭІН.**

— Да канца года перад намі пастаўлена задача давесці долю беларускіх лекаў да 50%. Мяркую, што мы з ёй справімся і задаволім патрэбы насельніцтва ў якасных і даступных лекавых сродках, — дадаў Уладзімір Шэін. — Беларуская фармацэўтычная прамысловасць стала канкурэнтаздольным гульцом як на ўнутраным, так і на знешніх рынках. Нашы лекі экспартуюцца ў 29 краін свету.

Сёння беларускія фармацэўтычныя вытворцы выпускаюць ужо больш як 4930 найменняў лекавых сродкаў. Кожны год рэгіструецца не менш за 100 новых прэпаратаў, вытворчасць якіх засвоілі нашы заводы. На засваенне выпуску джэнерыка (аналага арыгінальнага лекавага сродку) у сярэднім патрабуецца 2-3 гады.

СТАР. 3